# Бібліятэкі развіваюць карпаратыўнае супрацоўніцтва, а кафедры замежных моў — платныя паслугі

**Напрыканцы 2011 года ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце адбылося пасяджэнне прэзідыума Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ з удзелам міністра адукацыі С.А.Маскевіча. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі дзейнасць універсітэцкіх бібліятэк, укараненне электронных сродкаў навучання ў вучэбны працэс і стан выкладання замежных моў у вышэйшых навучальных установах. Па кожным з пытанняў папярэдне была даследавана сітуацыя ва ўсіх ВНУ і акумуляваны прапановы, накіраваныя на вырашэнне існуючых праблем.**

# Бібліятэкі развіваюць карпаратыўнае супрацоўніцтва, а кафедры замежных моў — платныя паслугі

## *Гэтыя пытанні разгледжаны на прэзідыуме Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ*

**Год назад фонд універсітэцкіх бібліятэк складаў каля 27,5 мільёна экзэмпляраў. За 2011 год ён папоўніўся прыкладна на 700 тысяч экзэмпляраў. Абнаўленне фондаў склала 3,1% у бібліятэках дзяржаўных ВНУ і 6% — прыватных. У гэты час агульная колькасць персаналу ўніверсітэцкіх бібліятэк складае 1800 чалавек, 78% мае вышэйшую адукацыю, пераважная большасць з іх — выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

### Электронная бібліятэка — гэта не проста камп'ютарны клас

Сучасныя ўніверсітэцкія бібліятэкі — гэта камп'ютарызаваныя і інтэрнэтызаваныя бібліятэкі. Як адзначыў рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Пётр Дзмітрыевіч Кухарчык, прыярытэтны напрамак развіцця бібліятэк — камп'ютарызацыя працэсаў, стварэнне і развіццё электронных баз, выкарыстанне ліцэнзійных электронных інфармацыйных рэсурсаў. Яшчэ адна тэндэнцыя — карпаратыўнае ўзаемадзеянне бібліятэк ВНУ. Бібліятэкі-партнёры сумесна вядуць каталагізацыю, удзельнічаюць у міжнародных і нацыянальных праектах (напрыклад, стварэнне карпаратыўнай базы даных “Вучоныя Беларусі”), кааперуюцца ў прадастаўленні доступу да фондаў кожнага з партнёраў.

Перспектыўнай формай аб'яднання электронных інфармацыйных рэсурсаў сёння з'яўляюцца электронныя бібліятэкі. “На пачатак 2011 года сукупны аб'ём кантэнту электронных бібліятэк ВНУ склаў каля 129 тысяч алічбаваных дакументаў, што на здзіўленне мала”, — адзначыў П.Д.Кухарчык. Пераважна гэта публікацыі прафесарска-выкладчыкага складу. Гэты інфармацыйны рэсурс мог бы выкарыстоўвацца беларускімі ВНУ карпаратыўна.

“Нягледзячы на тое, што ўніверсітэцкія бібліятэкі ствараюцца ў Беларусі на працягу пяці гадоў, дагэтуль не існуе ўніфікаванага, заснаванага на міжнародных стандартах падыходу да іх стварэння, — падкрэсліў рэктар БДПУ імя Максіма Танка. — Многія ў якасці электроннай бібліятэкі разглядаюць звычайны камп'ютарны клас з доступам да сеткавых інфармацыйных рэсурсаў і да інтэрнэту. Паўнацэнная электронная бібліятэка павінна прадастаўляць усе асноўныя паслугі традыцыйнай бібліятэкі”.

Вельмі важным з'яўляецца прадастаўленне чытачам доступу да знешніх рэсурсаў. Многія ўніверсітэцкія бібліятэкі для гэтага карыстаюцца паслугамі віртуальных чытальных залаў. Некаторыя рэктары адзначылі, што дорага каштуе доступ да баз даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На пасяджэнні было прапанавана разгледзець мэтазгоднасць і магчымасць далучэння да Берлінскай дэкларацыі аб адкрытым доступе да навуковых і гуманітарных ведаў. На гэты момант яшчэ ні адна беларуская ВНУ яе не падпісала. Між тым адзначана, што наяўнасць адкрытага навукова і адукацыйнага рэсурсу ўлічваецца ў міжнародным рэйтынгу Webometrics.

Вышэйшым навучальным установам прэзідыум савета рэктараў рэкамендаваў уключацца ў работу па стварэнні Нацыяльнай электроннай бібліятэкі, абнаўляць версіі праграм аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў, актывізаваць перавод картачных каталогаў у электронную форму, больш актыўна ствараць электронныя вучэбна-метадычныя комплексы і размяшчаць іх у электронных бібліятэках.

Міністр адукацыі звярнуў увагу на два моманты: у сувязі з шырокім укараненнем электронных адукацыйных рэсурсаў патрабуецца пошук новых падыходаў, па-першае, да крытэрыяў акрэдытацыі, а па-другое — да фарміравання штатаў бібліятэк.

### Стваральнікаў ЭВМК па-ранейшаму непакояць аўтарскія правы

Аб укараненні электронных сродкаў навучання ў вучэбны працэс далажыў рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Уладзіміравіч Абламейка. Ён зазначыў, што стратэгічнай мэтай развіцця электронных сродкаў навучання (ЭСН) з'яўляецца фарміраванне нацыянальнай сістэмы адкрытых электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР), якія будуць выкарыстоўвацца ўсімі жадаючымі для набыцця агульнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай ці дадатковай адукацыі. Па ацэнцы рэктара БДУ, работа ў гэтым кірунку праводзіцца фактычна ўсімі беларускімі ВНУ.

**У 2007—2010 гадах у краіне рэалізоўвалася галіновая праграма “Электронны падручнік”, у межах якой былі распрацаваны пілотныя праекты сучасных электронных вучэбна-метадычных комплексаў па 15 дысцыплінах. Развіццё ЭАР прадугледжана падпраграмай “Электроннае навучанне і развіццё чалавечага капіталу” Нацыянальнай праграмы паскоранага развіцця паслуг у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на 2011—2015 гады.**

“Зараз ва ўсіх ВНУ сфаміравана сучасная інфармацыйна-камунікацыйная інфраструктура, маецца доступ да нацыянальных і міжнародных навукова-адукацыйных сетак і інтэрнэту. У ВНУ ствараюцца электронныя бібліятэкі, якія забяспечваюць сістэматызацыю электронных адукацыйных рэсурсаў і доступ да іх”, — расказаў рэктар БДУ.

На думку С.У.Абламейкі, вельмі перспектыўным з'яўляецца выкарыстанне суперкамп'ютарных, грыд- і “воблачных” тэхналогій, якія ўжо сёння становяцца інструментарыем развіцця высокіх тэхналогій. Важна ўкараняць у вучэбны працэс сучасныя мультымедыйныя тэхналогіі, тэхналогіі відэаканферэнцсувязі і лічбавага вяшчання. Падобныя прыклады ўжо ёсць. Так, БДУІР, дзякуючы ўкараненню відэаканферэнцсувязі, атрымаў магчымасць праводзіць дыстанцыйную відэаатэстацыю студэнтаў.

Разам з тым для паспяховага развіцця сістэмы ЭАР і інфраструктуры патрэбна адпаведная навукова-метадычная падтрымка, якой сёння недастаткова, адзначыў Сяргей Уладзіміравіч Абламейка. ЭАР, распрацаваныя ў адной ВНУ, як правіла, маладаступныя студэнтам іншых навучальных устаноў. Не хапае каардынацыі работы па стварэнні і ўкараненні ЭАР, не наладжаны абмен вопытам у гэтым напрамку. Укараненне электронных адукацыйных рэсурсаў у межах дыстанцыйнай формы навучання стрымліваецца недасканаласцю нарматыўна-прававой базы, што рэгламентуе гэтую форму навучання.

Акрамя таго, не да канца вырашаны пытанні аўтарскіх правоў на ЭАР, якія выкладваюцца ў інтэрнэце. Аўтары электронных вучэбна-метадычных комплексаў неахвотна размяшчаюць іх у адкрытым доступе. Нават у межах аднаго ўніверсітэта на розных факультэтах могуць існаваць розныя падыходы да гэтага пытання: недзе лічыцца, што ВМК з'яўляюцца ўласнасцю ВНУ, а недзе — што ўсё ж такі аўтараў. Рэктары адзначылі, што дзеючы Закон Рэспублікі Беларусь “Аб аўтарскім праве і сумежных правах” мае на ўвазе толькі рамачныя нормы, а на практыцы патрэбны больш дэталёвыя механізмы.

### ВНУ будуць уводзіць платныя паслугі па іншамоўнай падрыхтоўцы

На актуальнасці якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў па замежных мовах (як для выкладання, так і для міжкультурнай камунікацыі) засярodзіла сваё выступленне рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля Пятроўна Баранава. Яна нагадала, што зараз рэалізоўваецца План мерапрыемстваў па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу па замежных мовах на ўсіх узроўнях адукацыі на 2010—2015 гады. Згодна з планам, у ВНУ фарміруецца адукацыйнае асяроддзе, заснаванае на інтэнсіфікацыі навучання мовам з выкарыстаннем актыўных форм і метадаў.

Не раз і раней адзначалася прамая сувязь вынікаў іншамоўнай падрыхтоўкі на ўзроўні вышэйшай адукацыі з якасцю навучання мовам у школе і, адпаведна, якасцю падрыхтоўкі настаўнікаў замежных моў. Па словах Н.П.Баранавай, варта разгледзець пытанні аб мэтазгоднасці завочнай падрыхтоўкі спецыялістаў па замежных мовах, а таксама падрыхтоўкі па здвоеных спецыяльнасцях.

Што тычыцца навучання замежным мовам па няпрофільных спецыяльнасцях, то рэктары прапаноўваюць дазволіць ВНУ самастойна будаваць гнуткую моўную палітыку. Напрыклад, разглядаецца такая мадэль: абавязковы курс плюс пралангаванае навучанне двух тыпаў. Першы — бюджэтны факультатыў для адораных матываваных студэнтаў, якія звязваюць сваю далейшую прафесійную дзейнасць з навуковым пошукам; другі тып — платныя адукацыйныя паслугі для студэнтаў, якія жадаюць глыбей ведаць замежную мову. “Па шляху арганізацыі дадатковага навучання замежным мовам на камерцыйнай аснове ідуць многія замежныя ВНУ”, — сказала Наталля Пятроўна Баранава.

Рэктар МДЛУ адзначыла, што вышэйшым навучальным установам патрабуюцца канкурэнтаздольныя вучэбна-метадычныя комплексы новага пакалення, прычым менавіта на аснове прафесійна арыентаванага навучання замежным мовам. Наталля Пятроўна падкрэсліла, што замежныя вучэбныя дапаможнікі мэтазгодна выкарыстоўваць у вучэбным працэсе толькі ў якасці дадатковых крыніц.

Прэзідыум савета рэктараў прапаноўвае рэарганізаваць сістэму моўнай адукацыі ў магістратуры: практыкаваць лекцыі на замежнай мове (такі вопыт ёсць, напрыклад, у Белдзяржуніверсітэце) і ўвесці ўступны экзамен.

Моўнае адукацыйнае асяроддзе ў ВНУ рэкамендавана ствараць праз доступ да бібліятэчных і іншых інфармацыйных крыніц на замежных мовах, арганізацыю аўдыторнай і пазааўдыторнай моўнай практыкі, у тым ліку з носьбітамі мовы, правядзенне тыдняў замежных моў, удзел у навуковых канферэнцыях і падрыхтоўку дакладаў на замежных мовах.

**Падрыхтоўку педагагічных кадраў па замежных мовах вядуць 11 ВНУ. Штогод на адпаведныя спецыяльнасці паступаюць больш за 2600 абітурыентаў. У 2010 годзе выпушчана 3010 педагогаў.**

Рэктары таксама абмеркавалі праект крытэрыяў для акрэдытацыі ВНУ, якія рыхтуюць выкладчыкаў замежных моў. Больш за ўсё аказалася нязгодных з крытэрыем наяўнасці 1% дактароў навук ад агульнай колькасці штатных выкладчыкаў тэорыі і практыкі замежнай мовы: на фоне зніжэння абарон дысертацый гэтая лічба падалася рэктарам завышанай. Колькасць кандыдатаў навук прапанавана давесці ў найбліжэйшыя гады да 15%. Сярод крытэрыяў, па якіх будзе ажыццяўляцца акрэдытацыя, напрыклад, абавязковыя стажыроўкі выкладчыкаў. Праўда, удзельнікі нарады прызналі, што больш танна будзе праводзіць іх у нашай краіне з запрашэннем замежных спецыялістаў і фарміраваць групы стажораў на міжуніверсітэцкай аснове.

Калі абагульніць задачы, якія стаяць перад ВНУ ў сувязі з павышэннем якасці навучання студэнтаў замежным мовам, то ў найбліжэйшыя гады будзе працягнута аптымізацыя вучэбных планаў, будзе арганізоўвацца павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў і выкладчыкаў замежных моў, забяспечвацца іх прафесійны рост, працягнецца ўдасканаленне вучэбных дапаможнікаў, укараненне перспектыўных тэхналогій навучання, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*

**У 2012 годзе Рэспубліканскі савет рэктараў ВНУ разгледзіць развіццё практыка-арыентаванай магістратуры, а таксама рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы развіцця вышэйшай адукацыі на 2011—2015 гады. На абмеркаванне прэзідыума савета рэктараў будуць вынесены наступныя пытанні: стан і перспектывы развіцця навуковых даследаванняў у ВНУ; нацыянальныя і міжнародныя рэйтынгі ВНУ; кадравы патэнцыял, падрыхтоўка і атэстацыя кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі; экспартны патэнцыял вышэйшай школы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ